# Беларус

75-ГОДЗЬДЗЕ!
Менск, 25 сакавіка 1918 г.:
«Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавай».
Рада БНР

№ 402 Чэрвень-ліпень 1993
Год выд. 42

BIELARUS / Belarusan Newspaper in the Free World. Published by the Belarusan American Ass'n, Inc.
Address: P. O. Box 178, Jamaica, N.Y. 11432, U.S.A. Price $2.50


## ПРЫСЯГА І ЗАРОК

**Да Першага Зьезду беларусаў сьвету**

Улетку 1919 году, калі чужацкія акупацыйныя сілы тапталі кволыя парасткі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасьці, Янка Купала ў вершы «Паўстань з народу нашага...» клікаў народнага Прарока і ўмаляў яго:

Зьбяры ў адну ўсю Беларусь сям'ю,
Вазьмі зь яе прысягу і зарок,
Што не прадасьць сябе, сваю
зямлю...
Зьняць путы Бацькаўшчыне ўстань,
Прарок...

Як і тры чверці стагодзьдзя таму, Купалава мальба гучыць і сёньня трывожна надзённым заклікам: не прадаць сябе, сваю зямлю, ня здрадзіць ідэі вольнай дэмакратычнай Беларусі!..

Путы парваныя, але ня зьнятыя. Яны відны яшчэ на шмат якіх помніках нядаўнае трагічнае мінуўшчыны, на вулічных знаках, назовах некаторых інстытуцыяў, на мове, на сьведамасьці. Яшчэ можа адбыцца гандаль Беларусяй...

У гэтым гістарычна адказным часе, упяршыню за паваеннае саракагодзьдзе, на пачатку ліпеня сёлета ў сталічным Менску зьбіраецца зблізку й здалёк Беларуская Сям'я, Першы Зьезд беларусаў сьвету.

Што гэта за падзея? Якое ейнае значэньне? Чым гэты зьезд павінен стацца?

Зьезд беларусаў сьвету — гэта далейшы, і вельмі важны, крок у замацоўваньні нацыянальна-ідэйнага адзінства беларускага народу і справы будаваньня беларускай дзяржаўнасьці.

Значэньне Зьезду беларусаў сьвету ў тым, што падзея гэтая дэманструе сабой прыцягальную сілу ідэалу Вольнай Беларусі, паказвае вернасьць гэтаму ідэалу раскіданых па цэлым сьвеце сыноў і дачок Бацькаўшчыны, іхную салідарнасьць з патрыётамі на родных землях.

Першы Зьезд беларусаў сьвету павінен запачаткаваць трыдыцыю гэткіх зьездаў — магчыма, што чатыры-пяць гадоў — каб ніколі больш не парывалася сувязь паміж грамадзянамі Беларусі і ўраджэнцамі Беларускай зямлі, раскіданымі па цэлым сьвеце — каб іх заўсёды лучыла духовая і фізычная повязь у працы і творчых намаганьнях на карысьць дэмакратыі, правоў чалавека, мірнага сужыцьця з суседзямі ды на дабро ўсіх грамадзянаў вольнай Беларускай Дзяржавы.

## ПРАГРАМА

### СЬВЯТКАВАНЬНЯЎ, КАНФЭРЭНЦЫЯЎ, ПЕРШАГА ЗЬЕЗДУ БЕЛАРУСАЎ СЬВЕТУ Ў БЕЛАРУСІ Ў ЧЭРВЕНІ-ЛІПЕНІ 1993 Г.

**25-27 чэрвеня** — у Менску й Заслаўі 200-годзьдзе Менскай епархіі.

**28 чэрвеня — 2 ліпеня** — у Горадні, у Горадзенскім Унівэрсытэце імя Янкі Купалы, Міжнародная канфэрэнцыя «Рым-IV», прысьвечаная праблемам узаемадзеяньня нацыянальных і рэгіянальных культураў, культурнаму памежжу Беларусі, Летувы, Польшчы і Украіны.

**6-7 ліпеня** — у Менску 3-я Ўсебеларуская палітычная канфэрэнцыя па пытаньнях:

1. Юрыдычная і палітычная ацэнка рашэньняў 2-й Бэрлінскай канфэрэнцыі.
2. Палітычная сытуацыя ў сучаснай Беларусі.
3. Прынцыпы канстытуцыйнага і дзяржаўнага ладу дэмакратычнай незалежнай Беларусі.

На канфэрэнцыю запрашаюцца прадстаўнікі ўсіх партый і рухаў дэмакратычнай арыентацыі, якія існуюць у Беларусі, і грамадзка-палітычных арганізацый беларускай дыяспары.

***5-11 ліпеня** — Першы зьезд беларусаў сьвету.*

Пленарныя паседжаньні (8-10 ліпеня) будуць праходзіць у Менску ў памешканьні Вялікага дзяржаўнага акадэмічнага тэатру опэры й балету. Рагістрацыя й разьмяшчэньне ўдзельнікаў зьезду будуць праводзіцца зь 5 ліпеня ў гатэлі «Беларусь».

Усе запрошаныя ўдзельнікі ў часе работы зьезду (5-11 ліпеня) забясьпечваюцца месцамі ў гатэлі, харчаваньнем і культурна-турыстычнай праграмай за кошт Аргкамітэту.

На 6-7 ліпеня для ўдзельнікаў зьезду заплянаваныя падарожжы і ўдзел у сьвяткаваньні Купальля, культурна-масавых мерапрыемствах у Навагрудку і Нясьвіжы. Аб сваіх асабістых плянах просіцца паведаміць Аргкамітэту на адрас: 220053 Беларусь, Менск, Даўгінаўскі тракт, 52-9. Нумары тэлефону: (0172) 273-238, 270-140, 370-544, 384-437; факс: (0172) 370-544 або 274-521.




### ПРАГРАМА (ПРЫКЛАДНАЯ) работы Першага Зьезду беларусаў сьвету 8-10 ліпеня 1993 г.

**8 ліпеня**
Адкрыцьцё зьезду.
Прывітаньні.
Асноўны даклад ад сусьветнай беларускай грамадзкасьці «Шляхі і пэрспэктывы беларускай дзяржаўнасьці».
Даклад ад ураду Рэспублікі Беларусь «Эканамічная сытуацыя і магчымасьці выхаду з крызісу».
Даклад ад Рады Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» «ЗБС 'Бацькаўшчына' на цярністым шляху яднаньня беларусаў сьвету».
Выступленьні ўдзельнікаў зьезду.
Вечар — канцэрт беларускага мастацтва.

**9 ліпеня**
Работа круглых сталоў па тэмах:
— Беларуская дзяржаўнасьць.
— Беларуская гаспадарка, прадпрымальніцтва.
— Беларуская культура і інш.

Асноўная мэта работы круглых сталоў — аналіз сытуацыі ў Беларусі ў адпаведнасьці са сваёю тэмаю, збор прапаноў, рэкамэндацый, парадаў для наладжваньня далейшага супрацоўніцтва, абмеркаваньне шляхоў дапамогі беларускай дыяспары з боку Рэспублікі Беларусь і аказаньне дапамогі рэспубліцы з боку замежных беларусаў. Форма работы — даклады, выступленьні, спрэчкі, дыскусіі, заўвагі, вольны абмен думкамі.

Вечар — сустрэчы па інтарэсах ва ўстановах, арганізацыях, на прадпрыемствах, у творчых саюзах, грамадзкіх арганізацыях.

**10 ліпеня**
Пленарнае паседжаньне.
Падагульненьне работы круглых сталоў, выступленьні кіраўнікоў.
Прыняцьце заключных дакумэнтаў.
Выбары кіруючых органаў.
Вечар — сяброўская вечарына, частаваньне беларускімі стравамі.

Пад час работы Зьезду беларусаў сьвету будзе праведзены Форум для беларускіх дзяцей у маляўнічым кутку Беларусі ў летніку на возеры Нарач. Вашы дзеці, унукі змогуць глыбей пазнаёміцца з народнымі звычаямі і традыцыямі, пасябраваць са сваімі аднагодкамі, зрабіць цікавыя вандроўкі па Беларусі, навучыцца сьпяваць беларускія народныя песьні. Удзельнікаў Форуму чакаюць цікавыя сустрэчы са знакамітымі людзьмі, экскурсіі, розныя імпрэзы і канцэрты, спартыўныя спаборніцтвы і гульні.

Пра ваша жаданьне прыняць удзел у Нарачанскім Форуме Аргкамітэт просіць паведаміць загадзя на вышэй падзеныя адрас ці нумары тэлефону і факсу.

## СТ. ШУШКЕВІЧ ЗАПРОШАНЫ Ў ЗША

На сустрэчы з амэрыканскім паслом па справах раззбраеньня Джэймсам Гудбі Старшыня ВС Беларусі Станіслаў Шушкевіч сказаў: «Я сапраўды атрымаў запрашэньне ад Вашага прэзыдэнта і вельмі ганаруся гэтым. Мы будзем самым старанным чынам рыхтавацца да гэтага візыту, каб ён быў выніковым, а ня проста прадстаўнічым». (ВТ, 29.04.93,11)

Візыт Шушкевіча ў Амэрыку, калі ня здарыцца нічога непрадбачанага, адбудзецца ў другой палавіне ліпеня сёлета.

### *«ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» ВАШЫНГТОН — МЕНСК*

Паводля амэрыканска-беларускай дамоўленасьці, дасягнутай на пачатку красавіка сёлета, амэрыканскі бок падрадзіўся даць Беларусі ў травені-чэрвені патрэбнае абсталяваньне для стварэньня першага каналу хуткадзейнай спадарожнікавай сувязі, гэтак званай гарачай лініі Менск — Вашынгтон. Увод каналу сувязі намечаны на 31 жніўня сёлета. Другая чарга лініі прадбачыцца на ліпень 1994 году. (ВТ, 9.04.93,9)

### *АКТЫВІЗАЦЫЯ ГРАМАДЗТВА*

У Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь зарэгістравана больш за 500 грамадзкіх арганізацыяў. Прадбачыцца, што ў недалёкай будучыні іх будзе 1,5 тысячы. Паводля колькасьці арганізацыяў на душу жыхарства, беларусы сустулаюць толькі расіянам. (ВТ, 17.05.93,16)

## ПОЛЬСКА-ЎКРАІНСКАЕ ПАДТРЫМАНЬНЕ БЧС

Прэзыдэнты Польшчы і Ўкраіны, Лех Валэнса і Леанід Краўчук — галоўныя прыхільнікі стварэньня ў Цэнтральнай Эўропе сыстэмы бясьпекі, у якую ўвайшлі-б усе дзяржавы Цэнтральнай Эўропы за выключэньнем Расеі. Вэнгерскі прем'ер Ёзэф Антал падтрымаў на мінулым месяцы гэтую ідэю ў сваіх гутарках з Краўчуком. Украінскія ўрадаўцы кажуць, што іншыя дзяржавы рэгіёну таксама падтрымваюць ідэю такога саюзу. Як паясьніў заступнік міністра замежных спраў Украіны Барыс Тарасюк, гутарка тут ідзе не пра стварэньне нейкага ваеннага блёку ці арганізацыі, а пра мэханізм сталых кансультацыяў. «Мы ня маем намеру ствараць ахоўную паласу паміж намі і Расеяй або недапушчаць Расею да інтэграцыі ў Эўропу», зазначыў Тарасюк.

Як сказаў аднак Валэнса на ўкраінскім тэлебачаньні ў часе нядаўнага візыту на Ўкраіну, у яго й Краўчука зашмат нутраных цяжкасьцяў, каб займацца цяпер справай кансалідацыі дачыненьняў паміж Украінай, Польшчай ды іншымі суседнімі дзяржавамі. (Паводля Ройтэра з Кіева, 24 травеня).

Балтыцка-чарнаморская садружнасьць, ідэю якое падтрымвае і Беларускі Народны Фронт, застаецца, такім чынам, справаю будучыні. Тым ня менш, ідэя гэтая мае сваіх уплывовых прыхільнікаў.

# Беларус

**50-ГОДЗЬДЗЕ!**

*«Другі Ўсебеларускі Кангрэс... пастанавіў: Вызнаць правільнай і зноў пацьвердзіць гістарычную пастанову Рады Беларускай Народнай Рэспублікі... 25 сакавіка 1918 г.»*

*Менск, 27 чэрвеня 1944 г.*

**№ 414 Ліпень 1994**
Год выд. 43

**BIELARUS** / Belarusan Newspaper in the Free World. Published by the Belarusan American Ass'n, Inc.
Address: P.O. Box 310178, Jamaica, N.Y. 11431-0178, U.S.A. Price $2.50


## ПЕРШЫ ПРЭЗЫДЭНТ БЕЛАРУСІ

Аляксандар Лукашэнка, здабыўшы ў другім туры выбараў 80 працэнтаў галасоў, паказаў, што ён умее займацца палітычным боксам. Цяпер перад ім і перад цэлай рэспублікай стаіць пытаньне: ці здолее ў Лукашэнку палітык перамагчы баксёра?

У атмасфэры эканамічнага заняпаду й маральнага разброду (вынік кебічаўска-намэнклятурнай палітыкі), здабыць бальшыню галасоў, абяцаючы «неадкладна 'павымятаць' карумпіраваных чыноўнікаў з вышэйшых орагаnaў улады» («Звязда», 29.03.94), выявілася нескладанай апэрацыяй: у перадвыбарчых выступленьнях Лукашэнка зацята даваў па сківіцах бюракратам рытарычнымі кулакамі ды прыгаворваў праклёны тым, хто разваліў «могучую старану (СССР), в которой мы все знали, что надо делать».

Але ці будзе ён ведаць, «что надо делать» менавіта цяпер, калі пачалася зусім новая фаза ў жыцьці рэспублікі, калі на галоўнае месца стала ўжо не лупцаваньне кебічаўцаў (хай сабе і заслужанае), а прыцягваньне да супрацоўніцтва як мага большае колькасьці людзей, стымуляваньне пазытыўных падыходаў і паглядаў, скіраваных на палепшаньне эканомікі ды на ўмацоўваньне дзяржаўнасьці, як перадумовы выхаду з гаспадарчага й маральнага крызісу. Ці 39-гадовы энтузіяст «моцнага кулака» будзе разумець, наколькі складаны працэс кіраваньня дзяржавай ва ўмовах незалежнасьці, дэмакратыі і свабоднага рынку? Ці ён здасьць усе прынцыпова важныя пастановы на водкуп Маскве, каб адтуль ізноў беспамыльна даведвацца, «что надо делать»?

Удача прэзыдэнта Лукашэнкі ў эканамічнай галіне, што стаіць на першым месцы, будзе залежаць ня толькі ад ягонага ўменьня палепшыць на карысьць Беларусі дзелавыя сувязі з Расеяй, але й ад ягонае здольнасьці стварыць сабе добрую рэпутацыю за мяжой, наладзіць па магчымасьці шырэйшыя кантакты з заходнім сьветам, дзе яго тымчасам ведаюць толькі, як «беларускага Жырыноўскага». Бо як-бы Лукашэнка ні набліжаў Беларусь да Расеі — «Прэзыдэнт ініцыіруе і будзе разьвіваць працэсы аб'яднаньня дзяржаў, якія раней уваходзілі ў састаў СССР» (пункт зь ягонай праграмы, «Звязда», 11.06.94) — беларуская эканоміка і дабрабыт народу могуць быць забясьпечаныя толькі пры ўмове шырокіх міжнародных сувязяў.

Цяпер у заходніх сталіцах будуць уважліва прыглядацца да новага прэзыдэнта ў Менску. А гэта перш-наперш у сувязі з геапалітычным палажэньнем Беларусі і ў выніку даволі вялікай улады, якую дае прэзыдэнту новая канстытуцыя рэспублікі. Важным ацэначным крытэрыем на Захадзе будзе Лукашэнкава стаўленьне да нацыянальнай дзяржаўнасьці. Калі ён будзе і надалей выступаць у ролі беларускага нігіліста, які адкідае афіцыйна прынятую дзяржаўную сымболіку і дэманстрацыйна носіць стары бээсэсэраўскі значок — знак свайго жаданьня вярнуць старое, дык такая цана ўвачч у вонкавага сьвету будзе і ачольванай ім рэспубліцы. Такое будзе й спрыяньне ейнаму дзяржаўнаму станаўленьню ды эканамічнай адбудове. Замежныя дыпляматы й бізнэсмэны будуць езьдзіць у Маскву, не затрымваючыся ў Менску.

Вонкавы сьвет будзе меркаваць пра адносіны новага беларускага кіраўніцтва да свае дзяржаўнасьці найперш паводля Лукашэнкавага стаўленьня да беларускай культуры, у тым ліку да роднай мовы, якую Лукашэнка ведае, але якую ён адкрыта ігнараваў на працягу ўсяе свае перадвыбарчае кампаніі, незважаючы на тое, што ў ягонай-жа праграме запісана: «Асаблівым клопатам прэзыдэнта павінна стаць беларуская нацыянальная культура». («Звязда», 11.06.94). Гэта што — пачатак ужо разьбежнасьці паміж словам і справай?..

Як адзначаюць некаторыя знаўцы беларускай сытуацыі, у тым ліку і гэткія, што не залічаюць сябе да лукашэнкаўскага лягеру, у новага прэзыдэнта Беларусі ёсьць «моцная каманда». У часе перадвыбарчай кампаніі ў ліку называных прозьвішчаў найчасьцей згадваліся народныя дэпутаты Дзьмітры Булахаў (г. нар. 1959) і Віктар Ганчар (г. нар. 1957), абодвы юрысты. Трэба спадзявацца, што ў Лукашэнкавай «камандзе» знойдуцца людзі, якія будуць разумець, што ўдача праграмы новага беларускага прэзыдэнта будзе залежаць не ад колькасьці сьвежых бюракратаў ля дзяржаўнага стырна, а ад таго, наколькі Лукашэнка здолее энэргізаваць фізычныя й духовыя рэсурсы народу на ўмацаваньне нацыянальнае дзяржаўнасьці ды адраджэньне беларускае культуры, а таксама наколькі яму ўдасца ўключыць заходнія дзяржавы ў працэс вываду Беларусі з крызіснага стану.

## БЕЛАРУСКІ НАРОД ЗРАБІЎ СВОЙ ВЫБАР І, ЗДАЕЦЦА, ПАМЫЛІЎСЯ

10-га ліпеня гэтага году на Беларусі быў абраны першы прэзыдэнт. Ім стаў саракагадовы дырэктар саўгасу, нястомны змагар з карупцыяй Аляксандар Лукашэнка.

Насуперак усім прагнозам выбары першага прэзыдэнта рэспублікі прайшлі даволі актыўна — у першым туры прынялі ўдзел каля 78 працэнтаў выбаршчыкаў, у другім — каля 70. Такім чынам, нягледзячы на вельмі моцную падтрымку афіцыйных сродкаў масавай інфармацыі, кандыдатуры прэм'ер-міністра Кебіча, пераважная большасьць выбаршчыкаў аддала свае сымпатыі Аляксандру Лукашэнку. У прыватнасьці, у другім туры за спадара Лукашэнку прагаласавалі па папярэдніх падліках 80,1 працэнту людзей, якія прынялі ўдзел у выбарах. А Вячаслаў Кебіч набраў усяго 14,2 працэнты галасоў. Сваё паражэньне Кебіч прызнаў ужо 11 ліпеня, не дачакаўшыся афіцыйнага падліку вынікаў выбараў. У гэты дзень Вячаслаў Кебіч выступіў з заявай, у якой, у прыватнасьці, адзначыў: «Нягледзячы на блізкасць нашых з Аляксандрам Рыгоравічам праграмаў, мы па-рознаму бачым шляхі іх ажыцьцяўленьня. Мы абмеркавалі сытуацыю ва ўрадзе, і сёньня я не бачу магчымасьці працягваць работу ў якасьці Старшыні Савета міністраў і заяўляю аб сваёй адстаўцы. Гэта азначае, што фактычна на Беларусі ад 11-га ліпеня пачаўся пэрыяд безуладзьдзя. Новы прэзыдэнт яшчэ не атрымаў свае паўнамоцтвы, а стары ўрад Кебіча фактычна іх ужо склаў. Відавочна, такая сітуацыя працягнецца дзесьці да 20-га ліпеня — менавіта на гэты дзень плянуецца сэсія Вярхоўнага Савета, якая і каранue Аляксандра Лукашэнку.

Чаго чакаць ад новага прэзыдэнта? Людзі, якія яго выбралі, спадзяюцца, што добры прэзыдэнт Лукашэнка хутка і вельмі проста вырашыць усе іхныя праблемы. А менавіта: у крамах зьявяцца танныя тавары і прадукты харчаваньня, дзяржава зноў будзе спраўна плаціць ім грошы (хай сабе й не зароблены імі) і наогул усё будзе як у часы існавання СССР: жыць будзе лепш, жыць будзе весялей. Вось толькі адкуль з'явяцца гэтыя даброты не ведаюць ня толькі выбаршчыкі Лукашэнкі, але, здаецца, і сам прэзыдэнт. Тлумачэньні Аляксандра Лукашэнкі наконт выхаду рэспублікі з крызісу пад яго кіраўніцтвам выглядаюць даволі наіўна. Спадар Лукашэнка спадзяецца, што варта яму толькі загадаць кіраўнікам прадпрыемстваў, запалохаць дырэктароў звальненнем з пасады, як фабрыкі й заводы Беларусі ўжо да новага году запрацуюць на поўную моц. Іншых шляхоў выйсця з крызісу з вуснаў свайго новаабранага лідэра беларусы не пачулі. Зрэшты, такая простая формула іх задавальняе. Вось толькі ці надоўга? Бо сытуацыя ў эканоміцы рэспублікі зараз крытычная: спад вытворчасьці каля 35 працэнтаў, інфляцыя да 50 працэнтаў у месяц. Натуральна, што каманднa-адміністрацыйнымі мерамі, якія прапануе Лукашэнка, вывесьці краіну з такога крызісу немагчыма. Патрэбны эканамічныя рэформы. Але аб іх прэзыдэнт падчас сваёй перадвыбарчай кампаніі гаварыў ня надта шмат. Лукашэнка, як і Кебіч, вельмі спадзяецца на аб'яднаньне грашовых сыстэм з Расеяй. І ўвогуле, што датычыць узаемаадносін з братняю Русьсю то тут погляды Кебіча і Лукашэнкі амаль цалкам супадаюць. Праўда, для выбаршчыкаў гэта было ўжо неважна. Людзі зьняверыліся ў Кебічу і ягонай камандзе і не паддаваліся ні на якія абяцанкі. Відавочна, такі-ж лёс чакае праз год-паўтары і ўсенароднага любімца Лукашэнку. Наўрад ці яму ўдасца даўжэй пратрымацца на крэдыты народнага даверу. А можа Аляксандру Рыгоравічу й не трэба большага? Бо, калі верыць яго выступленьням, ён будзе імкнуцца да рэанімацыі Савецкага Саюзу. Гэта значыць, першы прэзыдэнт незалежнай Беларусі можа стаць і апошнім, добраахвотна аддаўшы сваю краіну і яе народ у склад Расейскай імпэрыі. Бо відавочна, што нават аб'яднаўшы грашовыя сыстэмы з Расеяй, Беларусь перадасьць кантроль і кіраваньне сваёй

*(працяг на 2-ой б.)*

## КАРОТКІЯ БІЯГРАФІЧНЫЯ ЗЬВЕСТКІ АБ ПЕРШЫМ ПРЭЗЫДЭНЦЕ

Нарадзіўся ў 1954 годзе у вёсцы Александрына Шклоўскага раёну Магілёўскай вобласці. Беларус. Мае дзьве вышэйшыя адукацыі — скончыў Магілёўскі пэдагагічны інстытут і Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. У 1975 годзе пасьля заканэньня пэдагагічнага інстытуту працаваў сакратаром камітэту камсамолу сярodняй школы г. Шклова.

Ад 1975-га займаў розныя адміністрацыйныя пасады і быў партыйным кіраўніком у войску, на прадпрыемствах, ў калгасах і саўгасах, Шклоўшчыны.

Апошні год Аляксандар Лукашэнка працаваў старшынём парламенцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй, дзякуючы чаму, набыў папулярнасьць у народзе. Жанаты, мае двух сыноў. Жонка працуе выхавальніцай ў дзіцячым садку. Замежных моў, апрача рускай, ня ведае. Палітычныя куміры — Дзяржынскі, Андропаў, Машэраў. Па веравызнаньню праваслаўны. Пасля путчу 1991-га году выйшаў з камуністычнай партыі і да гэтага часу з'яўляецца беспартыйным. Аднак, падчас перадвыбарчай кампаніі Лукашэнку актыўна падтрымлівалі пракамуністычныя арганізацыі. Увесь час падкрэсьлівае, што быў адзіным дэпутатам, які галасаваў супраць Белавежскіх пагадненьняў аб ліквідацыі Савецкага Саюзу.

*4 октября 2016 года Минюст РФ внес Международный Мемориал в реестр «некоммерческих организаций, выполняющих функцию иностранного агента». Мы обжалуем это решение в суде.*

Библиотека Международного Мемориала